## Білет 11

**Практычнае заданне.**
**Вызваленне Беларусі ад нацысцкіх захопнікаў.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Якія воінскія фарміраванні прымалі ўдзел у вызваленні БССР ад нацысцкіх захопнікаў? Пакажыце іх размяшчэнне на картасхеме.
2. Якія два этапы выдзяляюць у аперацыі “Баграціён”?
3. Якую ролю ў вызваленні БССР ад нацысцкіх захопнікаў адыгралі беларускія партызаны?
4. Складзіце схему: “Прычыны паспяховасці Беларускай наступальнай аперацыі «Баграціён»”.

### I. Картасхема. Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён»



**II. Беларуская наступальная аперацыя "Баграціён".** *(па матэрыялах вучэбных дапаможнікаў «Гісторыя Беларусі 1917 г. – пачатак XXI ст. 9 клас», "Вялікая Айчынная вайна савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны")*

Лінія фронту на беларускім участку да пачатку аперацыі «Баграціён» праходзіла на ўсход ад Полацка, Віцебска, Оршы, Магілёва, Жлобіна, на захад ад Мазыра і далей уздоўж ракі Прыпяць да Ковеля.

У чэрвені 1944 г. пачалася Беларуская наступальная аперацыя "Баграціён". Яе план заключаўся ў наступным. Войскі Чырвонай Арміі, выкарыстоўваючы дапамогу партызан і мясцовых жыхароў, адначасова пераходзяць у наступленне на віцебскім, аршанскім і бабруйскім напрамках і магутнымі ўдарамі прарываюць абарону праціўніка. Затым яны ліквідуюць групоўкі ворага ў раёнах Віцебска і Бабруйска і наносяць удары на мінскім напрамку з мэтай акружэння і знішчэння войскаў праціўніка ў так званых «катлах».

Удар на франтавой лініі працягласцю 700 км наносілі чатыры франты: 1-ы Прыбалтыйскі пад камандаваннем генерала арміі І.Х. Баграмяна, 1, 2, 3-і Беларускія франты пад камандаваннем генерала арміі К.К. Ракасоўскага, генерал-палкоўнікаў Г.Ф. Захарава, І.Д.Чарняхоўскага. З войскамі ўзаемадзейнічалі партызаны.

Наступленне савецкіх войскаў быў нечаканым для ворага. Германскае камандаванне меркавала, што яно адбудзецца на тэрыторыі Украіны. Аднак аперацыя пачалася менавіта ў Беларусі, дзе былі цяжкапраходныя балоты і лясы. Пераадолець іх байцам Чырвонай Арміі дапамагалі мясцовыя жыхары і партызаны.

У ноч на 20 чэрвеня партызаны атакавалі чыгуначныя камунікацыі групы армій "Цэнтр" на ўсім працягу ад лініі фронту да дзяржаўнай граніцы. Усяго за адну ноч на 20 чэрвеня 1944 г. было перабіта 40775 рэек. Партызаны дэзарганізавалі рух, захапілі і ўтрымлівалі да падыходу Чырвонай Арміі дзясяткі чыгуначных станцый.

3 ліпеня 1944 г. быў вызвалены Мінск. На ўсходзе і паўднёвым усходзе ад Мінска было завершана акружэнне больш чым 100-тысячнай групоўкі войскаў праціўніка. У ходзе далейшага наступлення Чырвоная Армія 28 ліпеня вызваліла Брэст. Германскія захопнікі былі выгнаны з беларускай зямлі.

**III. К.К. Ракасоўскі. Разгром (***па матэрыялах хрэстаматыі "Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)").*

Поспех нашых войскаў у Беларускай аперацыі, на мой погляд, у значнай меры тлумачыцца тым, што Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандавання выбрала ўдалы момант для нанясення ўдару. <…>

Улічваючы выключныя цяжкасці дзеянняў у лясіста-багністай мясцовасці, мы правялі вялікія інжынерныя працы. Была наладжана і неабходная сувязь. Служба тылу здолела своечасова падвезці ўсё патрэбнае фронту і стварыць неабходныя запасы баявой тэхнікі, узбраення, боепрыпасаў, харчавання. <…>

У ходзе аперацыі паміж штабам фронту і камандуючымі арміямі, а таксама камандзірамі часцей была добра арганізавана сувязь, ажыццяўлялася цеснае ўзаемадзеянне. Камандуючыя арміямі прадэманстравалі выключна высокі ўзровень аператыўнага майстэрства, шырока прымянялі манеўр на акружэнне буйных груповак ворага. Камандзіры ўсіх ступеняў, якія атрымалі баявы вопыт у папярэдніх бітвах, умела кіравалі войскамі. Поспехам аперацыі мы былі абавязаны ўзросламу майстэрству, выключнай мужнасці, масаваму гераізму нашых воінаў. <…>